складаюць год. Што праўда, беднасьць ці недарод дазваляюць абысьціся дзевяцьма ці сяма стравамі.

Саму *куцьцю* ядуць з алеем ці мядовай сытой — як каму смакуе, але ня з тлушчам.

Першую лыжку зачэрпвае старэйшы ў хаце і грукае ёй у вакенца:

— Мароз-мароз, хадзі *куцьцю* есьці!

# Ланцуг

***Анатоль Вярцінскі***

*На ланцуг* можна некага пасадзіць, скажам, мядзьведзя, і тады ён робіцца, нібы сабака, *ланцужным*, ручным і нават можа навучыцца танчыць. *Ланцугом* можна зьвязаць, *у ланцугі* можна закаваць, *на ланцугу* можна зацягнуць у які-небудзь саюз-хаўрус.

І тады побач з *ланцугом* выстройваецца цэлы сынанімічны рад — аковы, кайданы, наручнікі. І тады паняцьце „*ланцуг*“ набывае сымбалічны сэнс — няволя, прыгнёт, беззаконьне, пазбаўленьне чалавека яго правоў і свабод.

У Янкі Купалы мы знаходзім радкі пра кайданавыя званы, пра акоў паломаных жандара, пра *ланцужны закон*. У 1911-м годзе ён мажорна заклікаў: „*Гэй ты, сонца, гары ад зары да зары,* ланцугі *распалі па ўсёй чыстай зямлі*“. Кастрычніцкае сонца *ланцугі* распаліла, але паплечнік Купалы Якуб Колас мусіў неўзабаве прызнацца: „*Кавалі другія, а* ланцуг *той самы, Песьні ўсё старыя, неаджытай гамы*“.

Трэба сказаць, што ў прылады пад назвай *ланцуг* ёсьць разам з названай яшчэ адна характэрная адмета — яго можна скінуць, яго можна парваць, яго можна пазбавіцца пры адпаведнай сіле духа ды пры адпаведных намаганьнях.

# Лапці

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Лапці* — рэч сымбалічна-сэнтымэнтальная. Савецкая эпоха *абула* нашую гісторыю *ў лапці*, а беларуская інтэлігенцыя абула ў іх сваю любоў да народу.

„А што яны нясуць на ў крыві руках, на ў *лапцях* нагах?“ — выгукнуў на пачатку стагодзьдзя Купала і ўвёў *лапаць* у шэраг адметнасьцяў беларуса. Але ўжо ў сярэдзіне стагодзьдзя адзін з герояў Коласавай „Дрыгвы“ Марка Балук крычыць: „Стой! *Лапаць* скінуўся!“ Гэтыя словы — пароль, пасьля якога пачынаецца кароткая сутычка арыштаваных з канвоем. Зброя апошніх пераходзіць у рукі першых. Гэта — пачатак барацьбы...

З паходжаньня слова *лапаць* — радня *лапіка*. Можа, таму мы імкнемся *залапіць лапцем* нашае невуцтва, нашую няведу саміх сябе. *Лапаць* як паказальнік беднасьці робіць *лапатнай* гістарычную сьвядомасьць.

Між тым гэты абутак быў тыповым толькі ў некаторых рэгіёнах Беларусі, і не таму, што там буяла беднасьць, а таму, што, выцягнуўшы нагу з балота, *лапаць* ня трэ было здымаць, каб выліць ваду.

*Абуць у* лапці. *На* лапці *не аб'ехаць. Плесьці кашалі з* лапцямі. Лапаць *знай* лапця, *а бот — бота,* — выразы добра вядомыя, але, як і сам плецены з лыка *лапаць*, мала ўжывальныя. Куды часьцей ужываліся пасталы — з